Slovak Aid
Belarusian Institute for Strategic Studies BISS

# Міжнародны
# МАНІТОРЫНГ

1 студзеня - 1 красавіка 2011

3 ЕС
6 Расія
8 Кітай
10 «Трэці свет»

Slovak Aid
The project is supported by The Slovak Agency for International Development

## Дарагія сябры!



Мы рады прадставіць вам першы выпуск Міжнароднага маніторынгу BISS — аналітычнага дакладу, прысвечанага ацэнцы найважнейшых тэндэнцый у міжнародных адносінах з удзелам Беларусі. У гэтым выпуску маніторынгу аналізуюцца чатыры знешнепалітычных вектары Беларусі: стасункі з Еўрапейскім саюзам, Расіяй, Кітаем і з краінамі «трэцяга свету». Задача Міжнароднага маніторынгу не толькі фіксаваць змены ў знешняй палітыцы Беларусі і становішчы нашай краіны на міжнароднай арэне, але таксама прапаноўваць свой прагноз развіцця асноўных знешнепалітычных кірункаў.

Уступленне ў мытны саюз з Расіяй і Казахстанам і леташнія прэзідэнцкія выбары радыкальна змянілі міжнароднае становішча Беларусі. Пасля 19 снежня можна казаць аб вяртанні аднавектарнай палітыкі афіцыйнага Мінску і палітыкі ізаляцыі з боку Захаду. Аднак не ўсё так адназначна. Унутры і вакол Беларусі сутыкаюцца і змагаюцца розныя інтарэсы, здольныя істотна скарэктаваць знешнепалітычныя вектары і памяняць сітуацыю калі не на процілеглую, то на істотна адрозную ад сённяшняй. Гэты выпуск Міжнароднага маніторынгу, які ахоплівае перыяд ад 1 студзеня да 31 сакавіка, якраз і ставіць перад сабой задачу разабрацца, дзе ж на сённяшні дзень знаходзіцца Беларусь у каардынатах міжнароднай палітыкі і якіх змен можна чакаць у бліжэйшыя месяцы.

Мы плануем, што Міжнародны маніторынг будзе выходзіць з перыядычнасцю адзін раз на два месяцы і ў далейшым будзе ахопліваць усё большы спектр знешнепалітычных адносін Беларусі. Спадзяемся таксама на вашы каментары і прапановы, якія дапамогуць нам зрабіць Маніторынг лепшым і цікавейшым.

Дзяніс Мельянцоў
Рэдактар Міжнароднага маніторынгу BISS

**Аўтары:** Яўген Прэйгерман, Георгій Плашчынскі, Андрэй Скрыба, Сяргей Богдан.

**Рэдактар:** Дзяніс Мельянцоў

# Зводныя індэксы развіцця знешнепалітычных вектараў




Менавіта такі экзатычны выгляд мае на сёняшні дзень беларуская знешнепалітычная “ружа вятроў”. Паколькі індэкс адносінаў з ЕС, па выніках разлікаў экспертаў, мае адмоўнае значэнне (-15), то заходні вектар змяніў свай напрамак па супрацьлеглы і ўзмоцніў такім чынам вектар усходні.

# Развіццё адносін Беларусі з Еўрапейскім Саюзам

**Выніковы індэкс: -15**
Сума пазітыўных балаў: **4**
Сума негатыўных балаў: **-19**




## Апісанне зыходнага стану адносін

Адносіны Беларусі і ЕС на працягу перыяду да пачатку бягучага маніторынгу развіваліся, галоўным чынам, у кантэксце прэзідэнцкай кампаніі. Пазітыўны трэнд, які вызначыўся да яе пачатку, атрымаў развіццё ў апошнім квартале 2010 г. дзякуючы відавочнай лібералізацыі грамадска-палітычнага жыцця на этапах збору подпісаў за вылучэнне кандыдатаў і агітацыі. Беларусь у гэты перыяд наведалі Прэзідэнт Літвы Д. Грыбаўскайце, міністры замежных спраў шэрагу краін ЕС, еўракамісары па пашырэнні і Еўрапейскай палітыцы суседства і па ахове здароўя і абароне правоў спажыўцоў. Еўракамісія працягвала распрацоўку (хоць і нетранспарэнтна) Сумеснага часовага плана (Joint Interim Plan), які павінен быў пры адсутнасці базавага пагаднення паміж ЕС і Беларуссю стаць пераходнай сістэмаўтваральнай асновай больш інтэнсіўнага супрацоўніцтва. Для стымулявання далейшай унутрыпалітычнай лібералізацыі падчас візіту міністраў замежных спраў Польшчы і Германіі Беларусі былі абяцаны € 3 млрд. у выпадку, калі выбары пройдуць у адпаведнасці з дэмакратычнымі стандартамі. Працягвалася актыўнае абмеркаванне і падрыхтоўка праектаў трансгранічнага супрацоўніцтва. Індыкатарам трэнду было пашырэнне супрацоўніцтва Беларусі з еўрапейскімі фінансавымі арганізацыямі. Негатыўна на гэтым фоне вылучалася хіба што праблема прадстаўніцтва Беларусі ў міжпарламенцкай структуры «Ўсходняга партнёрства» ЕЎРАНЭСТ.

Аднак звышстаноўчы трэнд у адносінах Беларусі і ЕС нечакана абарваўся ў выніку сілавога разгону дэманстрацыі 19 снежня 2010 г. і хвалі палітычна матываваных рэпрэсіяў, якая рушыла за ім. Еўрапейскі Саюз не прызнаў вынікі прэзідэнцкіх выбараў і рэзка асудзіў дзеянні беларускіх уладаў у паслявыбарчы перыяд.

## Апісанне найбольш важных падзей за перыяд

Перыяд маніторынгу ў адносінах Беларусі з ЕС прайшоў пад знакам пошуку Еўрасаюзам аптымальных варыянтаў рэакцыі на падзеі ў Беларусі. Пасля шэрагу аператыўных заяў, якія асудзілі дзеянні беларускіх уладаў, з боку афіцыйных асоб ЕС (у тым ліку сумеснай заявы К. Эштан і Х. Клінтан 5 студзеня), да больш дэталёвага вывучэння сітуацыі, якая склалася, прыступіў Еўрапейскі Парламент (ЕП). 12 студзеня адбылося пазачарговае пасяджэнне Камітэта па міжнародных справах, прысвечанае Беларусі. Была прынятая заява, якая пазначыла курс на выпрацоўку санкцый у дачыненні да афіцыйнага Мінска.

Для прадухілення або хаця б змякчэння патэнцыйных санкцый міністр замежных спраў Беларусі С. Мартынаў здзейсніў у студзені «дыпламатычнае турнэ-апраўданне» па некалькіх еўрапейскіх сталіцах. Ён спрабаваў данесці да калег у ЕС урадавую версію таго, што адбылося ў Беларусі. Характэрна, што, як паведамілі шэраг СМІ, С. Мартынаў актыўна выкарыстаў «геапалітычную карту»: казаў пра расійскі след у падзеях 19 снежня і пра нарастанне адчувальнасці расійскага ціску. Аднак аргументы міністра не знайшлі разумення ў ЕС.

20 студзеня ЕП прыняў рэзалюцыю па Беларусі. Фінальны тэкст аказаўся больш мяккім у параўнанні з праектамі рэзалюцыі, падрыхтаванымі фракцыямі Еўрапарламента. Тым не менш, рэзалюцыя заклікала (хоць у абцякальных фармулёўках) да досыць жорсткіх мер уздзеяння на рэжым А. Лукашэнкі: разглядзець магчымасць кропкавых эканамічных санкцый і

прыпынення макрафінансавай дапамогі; аднавіць і пашырыць візавыя санкцыі, «замарозіць» асабістыя актывы асоб, якія падпадаюць пад санкцыі; разглядзець магчымасць прыпынення ўдзелу Мінска ва «Усходнім Партнёрстве». Парламентарыі выказалі меркаванне, што міжнародныя спаборніцтвы, такія як Чэмпіянат свету па хакеі-2014, не павінны праводзіцца ў Беларусі, пакуль у краіне ёсць палітычныя зняволеныя.

31 студзеня заключэнне па Беларусі прыняў Савет ЕС. Дакумент апынуўся яшчэ менш жорсткім, чым выніковая рэзалюцыя ЕП ад 20 студзеня. Ён зацвердзіў візавую забарону і «замарозку» актываў у адносінах да 158 асоб, адказных за палітычныя рэпрэсіі ў Беларусі. Савет выказаў рашучасць павялічыць дапамогу беларускай грамадзянскай супольнасці, а таксама заявіў пра важнасць візавай фасілітацыі і зніжэння коштаў шэнгенскіх віз для беларускіх грамадзян. Савет таксама акцэнтаваў сваю прыхільнасць прадаўжэння «крытычнага дыялогу» з Беларуссю. Свайго роду лагічным працягам рашэння Савета ЕС стала міжнародная канферэнцыя «Салідарнасць з Беларуссю», якая прайшла 2 лютага ў Варшаве. Яна сабрала афіцыйных асоб і прадстаўнікоў НДА з краін ЕС, ЗША, Канады і «Усходняга партнёрства» (за выключэннем Беларусі). Вынікам канферэнцыі стала вылучэнне Беларусі € 87 млн. на патрэбы грамадзянскай супольнасці, развіцця дэмакратыі і дапамогі рэпрэсаваным. Каля 75% гэтай сумы выдаткавана краінамі і інстытутамі ЕС (у прыватнасці, Еўракамісія ў чатыры разы павялічыла аб'ём дапамогі Беларусі на 2011—13 гг.: з € 4 млн. да € 15,6 млн.).

На фоне дзеянняў беларускіх уладаў і ў рэчышчы тэндэнцыі на ўзмацненне жорсткасці пазіцыі ЕС 10 лютага кіраўнікі палітычных фракцыяў ЕП прынялі рашэнне «размарозіць» пытанне ЕЎРАНЭСТа і склікаць яго першую сесію без Беларусі. Некалькі кантрастна на гэтым фоне (хоць і ў адпаведнасці з заключэннем ад 31 студзеня) выглядала прынятае 28 лютага рашэнне Савета ЕС аб прадстаўленні Еўракамісіі мандата на пачатак перамоваў аб спрашчэнні візавага рэжыму з Беларуссю.

Развіццё падзей у Беларусі па канфрантацыйным сцэнары (працягваюцца ператрусы, арышты і допыты, вынясенне суровых судовых прысудаў, а таксама абнародаванне інфармацыі аб турэмных катаваннях) выклікала далейшую рэакцыю ЕС. 10 сакавіка – яшчэ адну рэзалюцыю, якая заклікае да больш жорсткіх мераў да асоб, якія спрычыніліся да парушэння правоў чалавека ў Беларусі. А 21 сакавіка Савет ЕС пашырыў спіс грамадзян Беларусі, у дачыненні да якіх дзейнічаюць санкцыі. У гэты ж дзень беларускі МЗС заявіў аб увядзенні зваротных санкцый: спіс (тайны) асоб, якім забаронены ўезд у Беларусь, а таксама ўзмацненне кантролю за незаконным фінансаваннем з-за мяжы палітычнай дзейнасці ў Беларусі.

## Асноўныя тэндэнцыі

**1) Рэзкае пагаршэнне адносін і лавінападобная эскалацыя канфлікту.** Гэтая тэндэнцыя вызначаецца шокам (як у Мінску, так і Брусэлі) ад таго, што адбылося, і відавочна выяўляецца ў шматлікіх негатыўных заявах, рэзалюцыях і ўзаемных санкцыях. З боку Еўрасаюзу шок выкліканы не столькі жорсткасцю дзеянняў беларускіх уладаў, колькі фактам такога «выхаду» афіцыйнага Мінска з дыялогавага працэсу з ЕС. Шмат кім у ЕС гэта было інтэрпрэтавана як падман з боку А. Лукашэнкі. Мяркуючы па ўсім, падобныя ацэнкі даюцца дзеянням ЕС і ў беларускім палітычным істэблішменце. Тэндэнцыя цалкам адпавядае логіцы канфлікту ў цэлым і псіхалагічным характарыстыкам аднаго з яго ўдзельнікаў — А. Лукашэнкі.

**2) Рост агульнай нявызначанасці адносна будучыні адносін.** Папярэдняя парадыгма палітыкі ЕС — «стратэгія сацыялізацыі і ўключэння» — правалілася (з пункту гледжання бягучага моманту). Аднак нейкай стратэгічнай альтэрнатывы ў ЕС няма. Няма выразнага стратэгічнага бачання і ў Беларусі. Пра гэта сведчаць «размытыя» фармулёўкі ў дакументах і заявах, якія з'яўляюцца вынікам таго, што часта складана сумясціць супярэчлівыя інтарэсы актараў.

**3)** (у кантэксце другой тэндэнцыі) **«Замарозка» папярэдніх планаў і актыўны пошук новых (або абноўленых старых) формаў супрацоўніцтва.** Фактычна «замарожанымі» сталі многія праекты трансгранічнага супрацоўніцтва, напрацоўкі ў межах «Усходняга партнёрства» і па лініі еўрапейскіх фінансавых інстытутаў. Адкладзены на нявызначаны тэрмін Сумесны часовы план. Пры гэтым усе праекты і напрацоўкі не адышлі ў нябыт, а адкладзеныя да высвятлення сітуацыі. Пра гэта сведчыць адсутнасць сапраўды жорсткіх

крокаў з боку ЕС, якія б зачынялі перспектыву вяртання адносін у дыялогавае рэчышча ўжо ў гэтым годзе. Больш за тое, фактычна для пачатку «размарозкі» Беларусі вылучана толькі адна ўмова: вызваленне і рэабілітацыя палітвязняў (што, дарэчы, падштурхоўвае беларускія ўлады да торгу). Першым крокам да новых форм супрацоўніцтва можна лічыць рашэнне ЕС адмовіцца ад прывязкі візавага пытання да праргэсу ў перамоўным працэсе з беларускім урадам. Гэта сведчыць аб узмацненні «двухтрэкавага падыходу» (double-track approach) да Беларусі, аднак пакуль не дае падстаў гаварыць аб фарміраванні новай стратэгіі.

## Прагноз на бліжэйшы перыяд

У бліжэйшыя месяцы канфлікт паміж Беларуссю і ЕС будзе захоўваць вастрыню. Не выключана нават эскалацыя ў выніку прыняцця ЕС кропкавых эканамічных санкцый у адказ на новыя судовыя прысуды. У той жа час абодва бакі захоўваюць зацікаўленасць у звароце да перамоўнага працэсу. Зыходзячы з таго, што беларускія ўлады не могуць дазволіць сабе вынесці мяккія прысуды асноўным фігурантам па справе «аб масавых беспарадках» (бо адной з задач судовых працэсаў з'яўляецца павышэнне ўзроўню страху ў грамадстве), то для іх няма пакуль сэнсу рабіць публічныя крокі насустрач ЕС. Эфект ад такіх крокаў (напрыклад, адмена смяротнага пакарання, дазаваны выпуск палітвязняў і г. д.) усё адно будзе перакрэслены судовымі рашэннямі. Аднак шмат часу на «раскачку» ў беларускіх уладаў таксама няма: набліжаецца чарговы электаральны цыкл, які традыцыйна патрабуе зніжэння вонкавай канфрантацыі; на фоне эканамічнага становішча, якое  імкліва пагаршаецца, расце ціск з боку Расіі. Таму можна чакаць, што, як і ў 2006—2007 гг., будуць зробленыя (ці ўжо робяцца) актыўныя спробы знайсці варыянты ўрэгулявання канфлікту і затым выхаду з яго па дыпламатычных каналах, у тым ліку нефармальных.

# Развіццё адносінаў Беларусі з Расіяй




**Выніковы індэкс: +20**
Сума пазітыўных балаў: **+42**
Сума негатыўных балаў: **-22**

## Апісанне зыходнага стану адносін

У цяперашні момант адносіны Беларусі і Расіі развіваюцца дынамічна, дамінуе трэнд на супрацоўніцтва і паглыбленне інтэграцыі паміж дзвюма краінамі, зададзены падпісаным у Маскве 9 снежня 2010 г. пакетам пагадненняў, якія ўтвараюць Адзіную эканамічную прастору сумесна з Казахстанам. Працягваецца будаўніцтва ЕўрАзЭС і Мытнага саюза, у рамках якога ідзе працэс узгаднення пазіцый і афармлення інстытутаў узаемадзеяння. Кіраўніцтва Расіі і Беларусі зноў стала актыўна выкарыстоўваць інтэграцыйную рыторыку, паднімаючы пытанні аб увядзенні адзінай валюты і стварэнні сумесных прадпрыемстваў.

Тым не менш, на фоне эканамічнай інтэграцыі паміж двума краінамі працягвае адсутнічаць паразуменне на палітычным узроўні. Прэзідэнт Расіі Дзмітрый Мядзведзеў імкнецца праводзіць знешнюю палітыку, заснаваную на дэмакратычных каштоўнасцях, правах чалавека і прынцыпе экстэрытарыяльнай абароны інтарэсаў расійскіх грамадзян. Расія больш не жадае пакідаць без увагі такія падзеі ў Беларусі, як разгон мірнай дэманстрацыі апазіцыі 19 снежня 2010 г., які суправаджаўся арыштам грамадзян Расіі. Кіраўніцтва Беларусі, імкнучыся пазбегнуць узмацнення расійскага ўплыву ў краіне, адначасова не мае свабоды манеўру для правядзення збалансаванай знешняй палітыкі пасля рэзкага пагаршэння адносін з заходнімі краінамі.

Такім чынам, не маючы магчымасці праводзіць па-сапраўднаму шматвектарную палітыку і валодаючы недахопам легітымнасці, Аляксандр Лукашэнка змушаны арыентавацца на супрацоўніцтва з РФ і ўдзел у інтэграцыйных праектах, якія выгадныя расійскім кіруючым элітам.

## Апісанне найбольш важных падзей за перыяд

У перыяд з 1 студзеня па 31 сакавіка сярод найбольш важных падзей у беларуска-расійскіх адносінах можна вылучыць праблемы з пастаўкамі нафты для перапрацоўкі на беларускіх НПЗ у пачатку 2011 года, абумоўленыя жаданнем Расіі павялічыць прыбытак сваіх пастаўшчыкоў энерганосьбітаў і скараціць рэнту беларускага ўрада. У выніку расійская нафта пацякла ў Беларусь толькі пасля таго, як спрэчныя пытанні былі вырашаны 25 студзеня на сустрэчы прэм'ер-міністра Беларусі Міхаіла Мясніковіча і прэм'ер-міністра Расіі Уладзіміра Пуціна.

Мабыць, самай негатыўнай падзеяй у адносінах дзвюх краін за гэты перыяд стала «справа Арцёма Брэуса і Івана Гапонова» — двух расійскіх грамадзян, якія спачатку атрымалі адміністрацыйны арышт за ўдзел у несанкцыянаваным мітынгу апазіцыі 19 снежня 2010 г., а затым былі абвінавачаныя ў арганізацыі масавых беспарадкаў з пагрозай атрымання крымінальнага тэрміну да 15 гадоў. Намаганні МЗС РФ і амбасады Расіі ў Беларусі па вызваленні сваіх грамадзян скончыліся поспехам: замест крымінальнага пакарання Брэус і Гапонаў былі асуджаныя толькі да выплаты штрафу ў памеры прыкладна 3,5 тысячы долараў кожны.

Сапраўдным прарывам у двухбаковых адносінах можна было б назваць правядзенне 15

сакавіка ў Мінску пасяджэння Савета міністраў Саюзнай дзяржавы, дзе быў падпісаны дакумент аб супрацоўніцтве ў будаўніцтве беларускай АЭС, а таксама абмяркоўваліся пытанні аб выдзяленні мэтавага доўгатэрміновага крэдыту ў памеры 9 мільярдаў долараў тэрмінам на 25 гадоў. Падпісанне дакумента суправаджалася заключэннем дадатковага міжурадавага пагаднення аб некаторых мерах па забеспячэнні паралельнай работы адзінай энэргетычнай сістэмы Расіі і аб'яднанай энэргетычнай сістэмы Беларусі. Гэта пагадненне прадугледжвае стварэнне на парытэтных пачатках да 1 ліпеня бягучага года сумеснага беларуска-расійскага прадпрыемства па збыце электраэнэргіі на аснове ААТ «Интер РАО ЕЭС» і «Белэнэрга».

Нарэшце, важнай падзеяй стаў зварот беларускага ўрада ў Антыкрызісны фонд ЕўрАзЭС за атрыманнем крэдыту ў памеры 2 мільярдаў долараў. На фоне валютнага крызісу, які разгортваецца ў Беларусі, урад звярнуліся да дадзенага сродку з мэтай стабілізаваць сітуацыю на валютным рынку.

## Асноўныя тэндэнцыі

Гэтыя падзеі дазваляюць казаць аб захаванні напружанасці ў беларуска-расійскіх адносінах на палітычным узроўні, нават нягледзячы на тое, што беларускі ўрад абвясціў своеасаблівую «перазагрузку» (сума негатыўных балаў у разліку індэкса гэта пацвярджае). Цяпер ён арыентаваны на супрацоўніцтва з Расіяй і гатовы ісці на кампрамісы і саступкі дзеля дасягнення сваіх знешнепалітычных мэтаў на ўсходнім кірунку.

Варта адзначыць, што неабходнасць захавання правоў чалавека і абароны расійскіх грамадзян стала сур'ёзна ўлічвацца пры выпрацоўцы расійскай знешняй палітыкі ў дачыненні да Беларусі. Расія таксама стала імкнуцца да пастаноўкі перад Беларуссю дакладных абавязацельстваў у супрацоўніцтве і ў вядомай ступені пачала ўжываць прынцып «абумоўленасці», што відаць на прыкладзе тых умоваў, якія выстаўляюцца перад беларускімі ўладамі як неабходныя для атрымання міжурадавага стабілізацыйнага крэдыту. Дастаткова актыўна развіваецца двухбаковае супрацоўніцтва на ўзроўні міністэрстваў і ведамстваў, а таксама шматбаковае супрацоўніцтва ў фармаце ЕўрАзЭС, Мытнага саюза і СНД.

## Прагноз на бліжэйшы перыяд

Прытрымліваючыся логікі развіцця адносін і ўлічваючы адсутнасць годных знешнепалітычных альтэрнатыў, Беларусь у бліжэйшы час працягне актыўнае супрацоўніцтва з Расіяй, застаючыся залежнай ад яе падтрымкі як ва ўнутраным, так і ў знешнім асяроддзі. Пры гэтым Расея працягне, у межах разумнага, настойваць на неабходнасці захавання ў Беларусі правоў чалавека і рэфармавання эканамічнай сістэмы.

Будзе развівацца супрацоўніцтва ў ваеннай сферы і вакол будаўніцтва АЭС у Астраўцы, а таксама будуць агучвацца новыя ініцыятывы ў сферы стварэння сумесных прадпрыемстваў, прыцягнення замежных інвестыцый і прыватызацыі.

Беларусь будзе і надалей прымаць актыўны ўдзел у інтэграцыйных працэсах на постсавецкай прасторы. Працягнецца будаўніцтва інтэграцыйных інстытутаў сумесна з Казахстанам і ўзгадненне знешнегандлёвых тарыфаў у межах Мытнага Саюза. Найбольш чаканай у беларуска-расійскіх адносінах падзеяй стане выдзяленне Беларусі стабілізацыйных крэдытаў, якія дазволяць палепшыць унутраную эканамічную сітуацыю.

# Развіццё адносін Беларусі з Кітаем

**Выніковы індэкс: +3**
Сума пазітыўных балаў: **+3**
Сума негатыўных балаў: **0**

3 0

## Апісанне зыходнага стану адносін

Найбольшы ўклад у высокі ўзровень беларуска-кітайскіх палітычных адносін уносіць эканамічнае супрацоўніцтва паміж дзвюма краінамі, спрыяючы развіццю гандлёвых адносін і прыцягненню кітайскіх інвестыцый у беларускую эканоміку. Пра гэта сведчыць істотны рост тавараабароту паміж краінамі. Калі ў 1990 г. тавараздварот Беларусі і Кітая складаў усяго 34 млн. даляраў, то ўжо ў крызісным 2008 г. гэты паказчык дасягнуў 2,2 млрд. даляраў. За першае паўгоддзе 2010 г. тавараздварот паміж краінамі склаў $ 1 млрд. 68 млн., што на 60% вышэй за паказчыкі папярэдняга года. Адначасова ствараюцца сумесныя беларуска-кітайскія прадпрыемствы ў абедзвюх краінах, прадастаўляюцца ўмовы кітайскім інвестарам для рэалізацыі ў Беларусі шэрагу будаўнічых і інвестыцыйных праектаў.

Эканамічнае супрацоўніцтва дзвюх краін працягвалася і ў банкаўскім сектары. У сакавіку 2009 г. Народны банк Кітая і Нацыянальны банк Рэспублікі Беларусь абвясцілі пра заключэнне двухбаковага пагаднення аб правядзенні валютнай здзелкі swap, у межах якой Беларусь атрымае 20 мільярдаў юаняў у абмен на 8 трыльёнаў беларускіх рублёў (на момант заключэння — 2,78 млрд. долараў). Такім чынам, Беларусь і Кітай перайшлі ў двухбаковым гандлі на разлікі ў нацыянальных валютах.

Не меншую значнасць для беларускай эканомікі маюць і прадастаўленыя кітайскім бокам крэдыты. Ва ўмовах крызісных з'яў у беларускай эканоміцы ў 2009—2010 гг., неабходнасці яе рэструктурызацыі пры важнасці захавання мадэрнізацыйных працэсаў, а таксама на фоне абвастрэння беларуска-расійскіх адносін напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў, кітайскія звязаныя крэдыты выявіліся істотнай падтрымкай, нягледзячы на ўмовы вылучэння, якія іх суправаджаюць.

## Апісанне найбольш важных падзей за перыяд

Пачатак 2011 году не адрозніваўся павышанай актыўнасцю ў беларуска-кітайскіх адносінах. Атрыманыя напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў у канцы 2010 года кітайскія крэдыты забяспечылі некаторую падтрымку беларускай эканоміцы, спрыяючы стварэнню новых прадпрыемстваў, мадэрнізацыі існуючых, а таксама прыцягненню кітайскіх інвестараў у Беларусь. Акрамя таго, палітычная падтрымка на вышэйшым узроўні і прызнанне вынікаў прэзідэнцкіх выбараў у Беларусі кітайскім бокам паказалі блізкасць пазіцый дзвюх краін, а таксама гатоўнасць працягваць развіццё двухбаковых адносін.

Аднак у студзені-сакавіку адносіны паміж Беларуссю і Кітаем былі цалкам зведзены да эканамічнага супрацоўніцтва на ўзроўні суб'ектаў гаспадарання. Працягнулася функцыянаванне сумесных прадпрыемстваў, закупка камплектуючых для мадэрнізацыі сумесных прадпрыемстваў, будаўніцтва жылля і стварэнне новых вытворчасцей у Беларусі. Што тычыцца абмеркавання перспектыў рэалізацыі далейшых сумесных праектаў, то яны абмяркоўваюцца пакуль на ўзроўні прадстаўнікоў кампаній дзвюх краін. Адсутнасць неабходнасці ўдзелу чыноўнікаў высокага і вышэйшага ўзроўняў у перамовах можа быць растлумачана ўнутранымі праблемамі ў беларускай эканоміцы, а таксама некаторым зніжэннем напружанасці беларуска-расійскіх адносін. Відавочна, што дасягненне дамоўленасці аб будаўніцтве ў Беларусі АЭС за кошт расійскага крэдыту, а таксама распачатыя перамовы аб

прадастаўленні іншых крэдытаў трохі знізілі інтэнсіўнасць беларуска-кітайскіх перамоваў, некаторыя ініцыятывы па сумесным эканамічным супрацоўніцтве былі адкладзеныя. Тым не менш, перамовы працягваюцца, пра што заявіў у сваім выступе саветнік пасольства КНР у Беларусі, згадаўшы, што Беларусь і Кітай разглядаюць магчымасць рэалізацыі каля 20 новых праектаў на суму больш як $ 5 млрд. долараў.

## Асноўныя тэндэнцыі

У беларуска-кітайскіх адносінах на сённяшні дзень прасочваюцца дзве тэндэнцыі. Першая — пастаянная блізкасць палітычных пазіцый на міжнароднай арэне па самым шырокім коле пытанняў, адмова ад крытыкі кіруючага кіраўніцтва і палітычнай сістэмы, узаемная падтрымка на міжнародных мерапрыемствах, канферэнцыях. Відавочна, гэтая тэндэнцыя будзе захоўвацца працяглы час з прычыны важнасці для беларускага кіраўніцтва палітычнай падтрымкі з боку адной з вядучых краін свету, эканамічнага лідэра Паўднёва-Усходняй Азіі і аднаго з пастаянных членаў Савета бяспекі ААН. Асабліва важная гэтая падтрымка на фоне цяперашніх, зусім не адназначных адносін з Расіяй.

Другая тэндэнцыя характарызуецца эканамічнымі адносінамі дзвюх краін. Ва ўмовах сусветнага эканамічнага крызісу, падзення тэмпаў знешняга гандлю, істотнага перавышэння імпарту над экспартам, а таксама неабходнасці рэструктурызацыі і мадэрнізацыі беларускай эканомікі краіна мае патрэбу ў інвестыцыях і нізкапрацэнтных крэдытах, якія прадстаўляюцца без папярэдніх палітычных умоў. Відавочна, што эканамічнае супрацоўніцтва дзвюх краін будзе развівацца ўмеранымі тэмпамі, працягнецца рост тавараздвароту, крэдытавання беларускай эканомікі і кітайскіх інвестыцый.

## Прагноз на бліжэйшы перыяд

Зніжэнне напружанасці ў беларуска-расійскіх адносінах трохі знізіла інтэнсіўнасць перамоваў з кітайскім бокам. Відавочна, гэты стан умеранага росту тавараздвароту і развіцця эканамічных адносін працягнецца ў бліжэйшыя месяцы, пакуль не праясніцца сітуацыя з умовамі фінансавання будаўніцтва беларускай АЭС і вылучэннем расійскіх крэдытаў. У той жа час, калі крызісныя з'явы ў беларускай эканоміцы працягнуцца і з'явіцца неабходнасць у большым фінансаванні, то прыцягненне новых валютных крэдытаў можа стаць сур'ёзнай нагрузкай на беларускі бюджэт у бліжэйшыя гады. З гэтай прычыны ў дадзенай сітуацыі магчыма аднаўленне перамоваў аб продажы мінарытарнага пакета акцый «Беларуськалія» кітайскаму боку, аднак на такі крок беларускае кіраўніцтва пойдзе толькі ў самым крайнім выпадку. Передумоў для актывізацыі палітычнага дыялогу ў бліжэйшыя месяцы не прадбачыцца, сустрэчы на высокім узроўні магчымыя толькі ў працоўным парадку для вырашэння бягучых пытанняў.

# Развіццё адносін Беларусі з «трэцім светам»




**Выніковы індэкс: +6**
Сума пазітыўных балаў: **+6**
Сума негатыўных балаў: **0**

## Апісанне зыходнага стану адносін

Адносіны Беларусі з «трэцім светам» слаба дыверсіфікаваныя і сканцэнтраваны ў асноўным на наступных краінах: КНР, Венесуэла, В'етнам, Іран, Сірыя. Акрамя таго, устойлівыя,але не гэтак інтэнсіўныя адносіны існуюць з Аманам, Лівіяй, ААЭ, Кубай, ПАР.

Асноўным напрамкам беларускай палітыкі ў гэтым рэгіёне з'яўляецца пошук рынкаў збыту, а таксама іншых эканамічных магчымасцяў для папаўнення адмоўнага знешнегандлёвага сальда краіны. У шэрагу выпадкаў пэўныя поспехі ў гэтым кірунку дасягнуты (Іран), але ў адносінах з шэрагам краін існуюць і значныя праблемы ў сувязі са значным сальда не на карысць Беларусі (КНР). Беларускі ўрад пазбягае ангажавання ў рызыкоўныя палітычныя прадпрыемствы, а таму, нягледзячы на гучную рыторыку, мяркуючы па ўсім, не пастаўляе краінам, якія знаходзяцца пад рэжымам міжнародных санкцый, альбо краінам, якія знаходзяцца ў прамой канфрантацыі з Захадам, сапраўды маштабных праектаў і пазбягае перадаваць ім небяспечныя ваенныя тэхналогіі і тэхніку.

## Апісанне найбольш важных падзей за перыяд

**Бірма.** 13—14 студзеня 2011 г. адбыўся візіт у Беларусь намесніка міністра замежных спраў Саюза М'янма Маунг Мынта. Кантакты з М'янмай носяць эпізадычны характар — толькі ў ліпені 2000 г. Беларусь наведаў міністр замежных спраў Бірмы У Він Аунг, а ў чэрвені 2010 г. адбыўся візіт беларускай дэлегацыі дзелавых колаў на чале з намеснікам міністра замежных спраў Сяргеем Алейнікам у М'янму.

**Іран.** На прэс-канферэнцыі з нагоды гадавіны рэвалюцыі пасол Ірана заявіў, што яго краіна рэалізуе ў Беларусі інвестыцыйныя праекты на суму каля $ 1,5 млрд., а ў стадыі перамоваў знаходзяцца таксама беларуска-іранскія праекты на суму больш як $ 1 млрд. У якасці прыкладаў ён назваў праект па будаўніцтве комплексу «Магніт-Мінск» іранскай кампаніяй «Кэйсан» на суму каля 250 млн. еўра, а таксама будаўніцтва транспартна-лагістычнага цэнтра «Прылессе» у СЭЗ «Мінск». Іранскія інвестыцыйныя праекты ў Беларусі шырока рэкламуюцца, як правіла, на стадыі намераў і абсалютная большасць іх не пераходзіць нават у стадыю праектавання, таму да заяў іранскага боку варта ставіцца з асцярогай. Цікава, што амбасадар зноў казаў на канферэнцыі аб існаванні ў Мінскім раёне зборачнай вытворчасці іранскіх аўтамабіляў «Саманд». Аднак яшчэ 15 лютага 2011 г. падчас абмеркавання ў Палаце прадстаўнікоў планаў урада на 2011—2015 гг. першы віцэ-прэм'ер Уладзімір Сямашка заявіў, што беларускі ўрад хоча адмовіцца ад зборкі іранскіх аўтамабіляў на карысць адной з кітайскіх мадэляў.

Сітуацыя вакол праекту здабычы нафты ў Іране застаецца нявызначанай і хутчэй за ўсё ў бліжэйшы час такой застанецца. Праблемы для рэалізацыі праекта існуюць з абодвух бакоў, а таму перспектывы яго паспяховай рэалізацыі выглядаюць даволі цьмяна.

**Куба.** 21—23 лютага 2011 г. Беларусь наведала афіцыйная кубінская дэлегацыя на чале з міністрам замежных спраў Бруна Радрыгесам Парыльей. З міністрам сустрэўся Лукашэнка, які заявіў, што Куба «з'яўляецца адным з нашых асноўных партнёраў у Цэнтральнай і Лацінскай Амерыцы».

Пік эканамічнага супрацоўніцтва з Кубай прыйшоўся на 2008 г., калі агульны гандлёвы абарот дасягнуў 49,7 млн. долараў, беларускі экспарт перавысіў 35 млн. долараў, кубінскі імпарт склаў 14,6 млн. долараў. Ужо ў 2010 г. таваразварот знізіўся да 7,4 млн. долараў, беларускі экспарт склаў 6,9 млн. долараў (аснову беларускіх паставак склалі аўтазапчасткі, грузавыя аўтамабілі, трактары і шыны).

**Гамбія.** У гэтым сэнсе Афрыка застаецца мала асвоеным беларускім бокам кантынентам. 28 лютага — 2 сакавіка 2011 г. адбыўся візіт міністра замежных спраў, міжнароднага супрацоўніцтва і гамбійцаў за мяжой Рэспублікі Гамбія Мамаду Тангара, які ужо пабываў у Беларусі ў мінулым годзе. Міністр замежных спраў Беларусі Мартынаў заявіў, што «ў параўнальна кароткі час Беларусь наведае міністр эканомікі і фінансаў Гамбіі са сваёй дэлегацыяй, і ў ходзе гэтага візіту мы спадзяемся прасунуцца па шляху нашага канкрэтнага супрацоўніцтва па шэрагу эканамічных пагадненняў і па тых камерцыйным прапановах, якія раней перадаваліся Гамбіі». Улічваючы сацыяльна-эканамічныя параметры гэтай невялікай афрыканскай краіны, наўрад ці гэтыя сувязі могуць прывесці да значных вынікаў.

**Іран.** 2—4 сакавіка 2010 г. адбыўся візіт міністра юстыцыі В. Галаванава ў Іран. Ён не толькі правёў традыцыйныя ў гэтым выпадку перамовы з міністрам юстыцыі Ірана Сяедам Мартазой Бахтыары, але і быў прыняты на даволі высокім узроўні кіраўніком судовай улады Ірана Садэкам Ларыджані і старшынёй парламента Алі Ларыджані. У ходзе візіту быў падпісаны дагавор аб выдачы, але як сведчыць ранейшая практыка ратыфікацыі беларуска-іранскіх дагавораў, падпісанне такой дамовы не азначае, што ён сапраўды ўступіць у дзеянне ў бліжэйшы час.

**Марока.** У рамках усё таго ж імкнення да дыверсіфікацыі сувязяў варта разглядаць візіт 3—4 сакавіка беларускай дэлегацыі ў Каралеўства Марока. Дэлегацыю ўзначаліў намеснік міністра замежных спраў Рэспублікі Беларусь Сяргей Алейнік. У склад дэлегацыі таксама ўвайшлі прадстаўнікі ААТ «МАЗ», РУП «МТЗ». Заяўленыя сустрэчы прайшлі на адносна нізкім узроўні, што сведчыць аб тым, што МЗС працягвае сутыкацца з праблемай забеспячэння эфектыўнасці такіх візітаў, якія, несумненна, патрабуюць сур'ёзнай экспертнай базы і папярэдняй прапрацоўкі.

**В'етнам.** У другой дэкадзе лютага адбыўся візіт у В'етнам дэлегацыі міністэрства абароны Беларусі на чале з памочнікам міністра абароны Рэспублікі Беларусь па ідэалагічнай рабоце ва Узброеных Сілах — начальнікам галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы міністэрства абароны генерал-маёрам Аляксандрам Гурай. Дэлегацыя была прынята на высокім узроўні — адбыліся сустрэчы з міністрам нацыянальнай абароны В'етнама Фунг Куанг Тханем і начальнікам Галоўнага палітычнага ўпраўлення В'етнамскай народнай арміі Нго Суан Лікам. В'етнам, як і Куба, з'яўляецца традыцыйным партнёрам Беларусі яшчэ з савецкіх часоў, а таму супрацоўніцтва з ім дастаткова стабільнае. У той жа час аб'ём в'етнамска-беларускага гандлю за 2010 г. склаў 145,9 млн. даляраў ЗША са значным станоўчым сальда на карысць Беларусі, што адрознівае гэтыя адносіны ад адносін з Кубай, слаба падмацаваных эканамічнымі аргументамі.

**Венесуэла.** У самым канцы сакавіка СМІ, у прыватнасці ўкраінскае агенцтва УНІАН, паведамілі аб адмове Беларусі ад венесуэльскай нафты. Падставай для такога вываду стала непаступленне азербайджанскай нафты па трубаправодзе Адэса-Броды, якая пастаўляецца ў Беларусь у рамках сеткі замяшчэння наўзамен венесуэльскай. У той жа час роля азербайджанскай нафты не зусім зразумелая, паколькі фізічныя пастаўкі венесуэльскай нафты ў Беларусь таксама ажыццяўляліся і, верагодна, ажыццяўляюцца (паколькі зафіксавана адпаведнае перамяшчэнне танкераў яшчэ ў сярэдзіне сакавіка). Першы віцэ-прэм'ер У. Сямашка абверг інфармацыю аб адмове Беларусі ад венесуэльскай нафты, хоць УНІАН са спасылкай на ананімную крыніцу заявіла, што адмова мела месца ў сувязі з расійскімі пастаўкамі, больш выгаднымі ў параўнанні з венесуэльскімі. У любым выпадку ідэя беларускага ўрада выкарыстоўваць у перамовах па нафце такі інструмент як альтэрнатыўныя крыніцы, захаваецца і ў далейшым. Прытым, у адрозненні ад беларуска-іранскіх адносін, у Венесуэле беларускі бок пры садзейнічанні кіраўніцтва краіны паспяхова рэалізуе шэраг праектаў па мадэрнізацыі краіны і здабычы нафты.

**Арабскія рэвалюцыі.** 27 студзеня прадстаўнік МЗС Беларусі адзначыў: «Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь занепакоенае развіццём сітуацыі ў Егіпце ў сувязі з масавымі акцыямі пратэсту, якія прайшлі ў найбуйнейшых гарадах краіны. Мы перакананыя, што вулічныя сутыкненні і гвалт — гэта дрэнны шлях вырашэння актуальных сацыяльных і грамадскіх праблем. Мы заклікаем бакі да вырашэння наяўных пытанняў выключна мірным

шляхам у рэчышчы міжнародна-прававых нормаў за сталом перамоваў».

Яшчэ больш характэрным адлюстраваннем унутрыпалітычнай сітуацыі ў Беларусі сталі заявы па Лівіі. І калі першапачаткова было заяўлена аб падтрымцы рэзалюцыі Савета Бяспекі па Лівіі, то ўжо праз два дні МЗС фактычна выступіў у падтрымку Кадафі: «Рэспубліка Беларусь заклікае дзяржавы, якія прымаюць удзел у ваеннай аперацыі, неадкладна спыніць баявыя дзеянні, якія прыводзяць да чалавечых ахвяр. Урэгуляванне канфлікту з'яўляецца ўнутранай справай Лівіі і павінна быць забяспечана самім лівійскім народам без ваеннага ўмяшання звонку». Гэта заява адлюстроўвае даволі рызыкоўную знешнепалітычную лінію ва ўмовах, калі гэтак яркая падтрымка Кадафі стала працягам канфрантацыі з заходнімі краінамі ўжо па небеларускіх пытаннях. У той жа час самую заяву наўрад ці можна лічыць заснаванай на грунтоўным аналізе міжнароднай сітуацыі, г. зн. МЗС фактычна ўзяў курс на канфрантацыю з Захадам, і нават калі гэты курс абумоўлены не ідэалагічна, а нейкімі матэрыяльнымі ўзнагародамі з боку Кадафі, то гэта ўсё роўна цяжка лічыць прадуманым крокам беларускай дыпламатыі.

## Асноўныя тэндэнцыі

Пошук новых партнёраў (кантакты з М’янмай, Гамбіяй, Марока) у цэлым малапаспяховы, хоць і ажыццяўляецца ўжо даволі даўно. На гэта паказваюць візіты дэлегацый, узначаленых, як правіла, першым намеснікам міністра замежных спраў Алейнікам у краіны, якія разглядаюцца ў якасці перспектыўных партнёраў.

Геаграфія сувязяў застаецца звычайнай, за выключэннем, мабыць, трохі менш актыўных кантактаў з Венесуэлай, а таксама магчымай адмовы ад нафтавых паставак з гэтай краіны. Паслабленне такога супрацоўніцтва магло быць абумоўлена ціскам Расіі, зацікаўленай у захаванні сваёй нафтагазавай манаполіі ва Усходняй Еўропе.

Беларусь, якая патрабуе мадэрнізацыі эканомікі, не можа прыцягнуць адпаведныя інвестыцыі з краін, якія развіваюцца, і нават тыя інвестыцыі, якія прыходзяць, у большасці сваёй не спрыяюць мадэрнізацыі, паколькі тычацца нізкатэхналагічных, экалагічна брудных вытворчасцяў у галіне здабычы карысных выкапняў (граніт), вытворчасці нізкатэхналагічных будматэрыялаў (цэмент) або зборачных вытворчасцяў (легкавыя аўтамабілі).

## Прагноз на бліжэйшы перыяд

Магчыма, будзе перагледжаная агульная стратэгія ў бок больш рызыкоўных варыянтаў знешнепалітычнага курсу, пра што могуць сведчыць падазроныя здарэнні ў Кот-д'Івуары, магчымыя кантакты з Кадафі і асабліва яркая антызаходняя пазіцыя МЗС у яго падтрымку. Такі перагляд знешняй палітыкі будзе мець месца відавочна не на ўзроўні МЗС, і хутчэй за ўсё ўвогуле па-за яго структурай.

Заняўшы ў цяперашні час антызаходнюю пазіцыю, беларускае кіраўніцтва, верагодна, перайшло пэўную мяжу, і заходнія краіны не будуць больш закрываць вочы на шматлікія дзеянні Беларусі ў «трэцім свеце», якіх яны раней лічылі за лепшае не заўважаць.

Несумненна, беларускае кіраўніцтва хацела б і паспрабуе зноў пашырыць і паглыбіць супрацоўніцтва з краінамі, якія развіваюцца, каб папоўніць адсутнасць супрацоўніцтва з заходнімі краінамі. Аднак самыя лёгкія магчымасці для гэтага ўжо даўно выкарыстаны, а «адкрыць» для беларускага гандлю і прамысловасці новыя краіны пры нізкім узроўні экспертнай базы, неэфектыўнай структуры шэрагу органаў дзяржкіравання Беларусі практычна немагчыма.

Найбольш паспяховыя праекты будуць ажыццяўляцца з краінамі, якія прагматычна будуюць свае адносіны з Беларуссю, абапіраючыся на вопыт доўгатэрміновага супрацоўніцтва — КНР, В'етнам, Турцыя. У той жа час інвестыцыі і тэхналогіі, якія прыходзяць у Беларусь у рамках інвестыцыйных праектаў, не вырашаюць задач па мадэрнізацыі краіны.

Дадатак

Каталог падзей, на аснове якіх эксперты вызначалі індэкс развіцця адносін.

# Развіццё адносін Беларусі з Еўрапейскім Саюзам

| Дата | Падзея | Бал |
|---|---|---|
| **05/01** | Сумесная заява К. Эштан і Х. Клінтан<br>(надала праблеме трансатлантычны характар) | **- 1** |
| **12/01** | Пазачарговае пасяджэнне Камітэта па міжнародных справах Еўрапарламента, прысвечанае Беларусі, і выніковая заява<br>(узяты курс на выпрацоўку санкцый) | **- 1** |
| **Студзень** | «Дыпламатычнае турнэ-апраўданне» С. Мартынава<br>(спроба не дапусціць абнулення вынікаў двухгадовай (2008-2010 гг.) работы па наладжванні дыялогу з ЕС) | **1** |
| **20/01** | Рэзалюцыя Еўрапейскага парламента па Беларусі | **- 1** |
| **31/01** | Заключэнні Савета ЕС па Беларусі | **- 3** |
| **02/02** | Канферэнцыя «Салідарнасць з Беларуссю» ў Варшаве<br>(афіцыйны Мінск не быў запрошаны на канферэнцыю) | **- 2** |
| **10/02** | Рашэнне палітычных фракцый Еўрапарламенту аб скліканні першага пасяджэння ЕЎРАНЕСТ без Беларусі | **- 2** |
| **28/02** | Рашэнне Савета ЕС даць Еўракамісіі мандат на перамовы аб спрашчэнні візавага рэжыму з Беларуссю | **2** |
| **03/03** | Дзевяць краін (не члены ЕС) далучыліся да санкцый Еўрасаюзу<br>(ўзмацненне для Беларусі знешнепалітычнага эфекту ад санкцый) | **- 1** |
| **10/03** | Рэзалюцыя ЕП, што заклікала прымяніць больш жорсткія санкцыі да асоб, якія маюць дачыненне да парушэння правоў чалавека ў Беларусі | **- 1** |
| **21/03** | Рашэнне Савета ЕС аб пашырэнні спісу грамадзян Беларусі, у дачыненні да якіх дзейнічаюць абмежавальныя санкцыі<br>(далейшая эскалацыя канфлікту) | **- 2** |
| **21/03** | Заява МЗС Беларусі аб увядзенні зваротных санкцый у дачыненні да некаторых прадстаўнікоў ЕС | **- 3** |
| **студзень—сакавік** | Шматлікія негатыўныя (і нават абразлівыя) заявы афіцыйных асоб з абодвух бакоў і шматлікія негатыўныя матэрыялы ў СМІ | **- 2** |
| **люты—сакавік** | Серыя кансультацый паміж міністэрствамі замежных спраў Беларусі і шэрага краін ЕС (Латвія, Літва, Славенія)<br>(захаванне мінімальнага камунікацыйнага канала на афіцыйным узроўні) | **1** |
| **Разам** | | **- 15** |

# Развіццё адносінаў Беларусі з Расіяй

| Дата | Падзея | Бал |
|---|---|---|
| **6 — 25 студзеня** | Беларусь і Расія не могуць дамовіцца адносна формулы цаны паставак бяспошліннай нафты | - 3 |
| **12 студзеня** | Анатоль Рубінаў, старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу РБ: «Расія — не проста партнёр, а дзяржава, блізкая па культуры і мове. Гэта краіна, з якой мы жылі стагоддзямі і будзем жыць» | 1 |
| **13 студзеня** | Сяргей Лаўроў: «Нікога з расійскіх палітыкаў або афіцыйных асоб не запрашалі на інаўгурацыю прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі» | -2 |
| **13 студзеня** | Сяргей Лаўроў: «Рэзалюцыя Савета Еўропы па Беларусі адлюстроўвае і пункт гледжання Расіі» | - 2 |
| **18 студзеня** | Дэпартамент інфармацыі і друку МЗС Расіі са шкадаваннем успрыняў адмову беларускіх уладаў падоўжыць акрэдытацыю карэспандэнту «Камерсанта» у Беларусі Маўсуну Гаджыеву | - 1 |
| **20 студзеня** | Візіт прэм'ер-міністра Беларусі Міхаіла Мясніковіча ў Маскву і сустрэча з кіраўніком урада РФ Уладзімірам Пуціным. Абмеркаванне газавых і нафтавых кантрактаў, сітуацыі вакол арышту расійскіх грамадзян, пасяджэнні саюзнага Саўміна. | 3 |
| **21 студзеня** | Інаўгурацыйная прамова Лукашэнкі: «Мы працягнем будаўніцтва Саюзнай дзяржавы, умацаванне інтэграцыйных сувязяў у рамках Адзінай эканамічнай прасторы, ЕўрАзЭС, СНД» | 1 |
| **25 студзеня** | Перамовы прэм'ер-міністра Беларусі Міхаіла Мясніковіча і кіраўніка «Росатама» Сяргея Кірыенкі аб падпісанні пагаднення аб будаўніцтве ў Беларусі АЭС | 2 |
| **26 студзеня** | Дзярждума РФ ратыфікавала міжурадавае пагадненне аб забеспячэнні ўзаемных паставак прадукцыі ваеннага, двайнога і грамадзянскага прызначэння ў перыяды, калі існуе пагроза агрэсіі або ідзе вайна | 4 |
| **28 студзеня** | Амбасада Расіі са здзіўленнем і шкадаваннем успрыняла заяву генеральнага пракурора Беларусі Рыгора Васілевіча ў сувязі з лёсам арыштаваных у Мінску па справе аб масавых беспарадках 19 снежня расійскіх грамадзян Арцёма Брэуса і Івана Гапонова | - 1 |
| **28 студзеня** | Кіраўнік Нацыянальнага банка Беларусі Пётр Пракаповіч 28 студзеня заявіў, што падтрымлівае перспектыву пераходу на адзіную валюту ў рамках АЭП | 1 |
| **1 лютага** | МЗС РФ: «Аднабаковыя санкцыі ў дачыненні да Беларусі будуць мець контрпрадуктыўны характар» | 1 |
| **2 лютага** | Прэзідэнт РФ Дзмітрый Мядзведзеў: «Мяне таксама здзіўляе тое, што адбылося ў Беларусі, і я даў даручэнне, каб на тыя аргументы, якія вы (праваабаронцы — заўв.) прыводзіце ў сваім звароце, звярнула ўвагу міністэрства замежных спраў пры выпрацоўцы дыпламатычнай пазіцыі Расійскай Федэрацыі » | - 1 |
| **2 лютага** | Сяргей Лаўроў: «Масавыя арышты пасля выбараў у Беларусі з'яўляюцца непрымальнымі» | - 1 |
| **3 лютага** | Аляксандр Лукашэнка: «Мяне гэта да глыбіні душы абурае. Вы забыліся, што вы працуеце не ў Расіі, а ў Беларусі. І пытанні карупцыі, пытанні дзяльбы, ціску, дамоўленасці за рамкамі маіх рашэнняў недапушчальныя» | - 1 |

| Дата | Падзея | Бал |
|---|---|---|
| **7 лютага** | Аляксандр Лукашэнка ў ходзе водпуску ў Сочы, нягледзячы на першапачатковы намер сустрэцца з дзелавымі і ўладнымі коламі Расіі, афіцыйна ні з кім не сустрэўся | **- 2** |
| **8 лютага** | Сяргей Лаўроў: «Тое, што адбылося пасля выбараў, было абсалютна непатрэбным і непрымальным. Мы заклікаем вызваліць кандыдатаў у прэзідэнты, вызваліць журналістаў, праваабаронцаў, а таксама і двух нашых грамадзян, якім да гэтага часу не прад'яўленыя ніякія абвінавачванні» | **-1** |
| **9 лютага** | У Мінску прайшлі кансультацыі міністэрстваў замежных спраў Беларусі і Расіі: удзельнічалі намеснік міністра замежных спраў РФ Рыгор Карасін і намеснік міністра замежных спраў Беларусі Ігар Петрышэнка | **2** |
| **16 лютага** | Беларусь дасягнула абсалютнага кампрамісу з «Газпромам» у перамовах па пастаўках газу, паведаміў першы намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Уладзімір Сямашка | **1** |
| **16 лютага** | Пытанне аб прызнанні Беларуссю незалежнасці Паўднёвай Асетыі і Абхазіі на сесіі разглядацца не будзе, заявіў старшыня міжнароднай камісіі і сувязях з СНД ніжняй палаты беларускага парламента Палаты прадстаўнікоў Ігар Карпенка | **- 1** |
| **16 лютага** | Уладзімір Сямашка: «Расія не выконвае свае абавязацельствы па пастаўках нафты ў Беларусь» | **- 3** |
| **25 лютага** | Лукашэнка: «На палітычным узроўні (з Расіяй — заўв.) Усе пытанні вырашаныя, асноўныя пагадненні падпісаныя. Эканамічны эфект ад прамога супрацоўніцтва з расійскімі рэгіёнамі папросту зацемніць любыя гандлёвыя абароты з далёкім замежжам». | **1** |
| **1 сакавіка** | Аляксандр Лукашэнка зацвердзіў план мерапрыемстваў па рэалізацыі рашэнняў снежаньскай сесіі Савета калектыўнай бяспекі АДКБ у ходзе сустрэчы ў Мінску з генеральным сакратаром АДКБ Мікалаем Бардзюжам | **2** |
| **4 сакавіка** | Расійскія СМІ негатыўна каментуюць «чорныя спісы» дзеячаў культуры Беларусі, куды трапілі і расійскія артысты | **- 1** |
| **6 сакавіка** | Аляксандр Лукашэнка ў інтэрв'ю Washington Post: «Мы з Пуціным у вельмі добрых адносінах. Мы больш дзесяці гадоў працуем разам, і раю вам не дэманізаваць Пуціна» | **1** |
| **12 сакавіка** | Намеснік міністра эканомікі Беларусі Антон Кудасаў: «МС працуе на карысць Беларусі і яе партнёраў. Тое, што нам не ўдалося зрабіць паасобку, думаю, удасца зрабіць дзякуючы каапераці з Расіяй і Казахстанам» | **1** |
| **14 сакавіка** | Аляксандр Лукашэнка адобрыў праект міжурадавага пагаднення паміж Рэспублікай Беларусь і Расійскай Федэрацыяй аб супрацоўніцтве ў будаўніцтве на тэрыторыі Беларусі атамнай электрастанцыі з улікам змяненняў прынцыповага характару, унесеных у выніку правядзення перамоў з расійскім бокам | **1** |
| **14 сакавіка** | У Мінску праходзіць пасяджэнне Камісіі Мытнага саюза (МС) Беларусі, Казахстана і Расіі на ўзроўні віцэ-прэм'ераў. Беларускую дэлегацыю на пасяджэнні ўзначальвае віцэ-прэм'ер Сяргей Румас, казахстанскую — першы віцэ-прэм'ер Умірзак Шукееў, расійскую — першы віцэ-прэм'ер Ігар Шувалаў. Прынятае рашэнне адмяніць з 1 красавіка транспартны кантроль на беларуска-расійскай мяжы | **2** |

| Дата | Падзея | Бал |
|---|---|---|
| **14 сакавіка** | У Мінску ў фармаце адзін на адзін адбылася сустрэча прэм'ер-міністра Расіі Уладзіміра Пуціна і кіраўніка беларускай дзяржавы Аляксандра Лукашэнкі | **3** |
| **15 сакавіка** | Пасяджэнне Савета міністраў Саюзнай дзяржавы. Падпісаны: дакумент аб супрацоўніцтве ў будаўніцтве беларускай АЭС, міжурадавае пагадненне аб некаторых мерах па забеспячэнні паралельнай работы адзінай энергетычнай сістэмы Расіі і аб'яднанай энергетычнай сістэмы Беларусі, міжурадавае пагадненне аб супрацоўніцтве ў галіне даследавання і выкарыстання касмічнай прасторы ў мірных мэтах, міжведамаснае пагадненне аб прымяненні дагавора паміж Беларуссю і Расіяй аб супрацоўніцтве ў галіне сацыяльнага забеспячэння ад 24 студзеня 2006 года. | **3** |
| **15 сакавіка** | У Нацыянальнай бібліятэцы Мінска праходзіць пасяджэнне Міждзяржсавета ЕўрАзЭС пад кіраўніцтвам прэм'ер-міністраў Беларусі Міхаіла Мясніковіча, Казахстана Карыма Масімава і Расіі Уладзіміра Пуціна. | **3** |
| **15 сакавіка** | Агульны аб'ём субсідавання беларускай эканомікі складзе ў 2011 годзе прыкладна 4,3 мільярда долараў. Пра гэта заявіў у Мінску прэм'ер-міністр Расіі Уладзімір Пуцін. | **- 1** |
| **17 сакавіка** | «Падзеі, звязаныя з затрыманнем у Мінску грамадзяніна Расіі Юрава, вартыя жалю», — сказаў афіцыйны прадстаўнік МЗС РФ Аляксандр Лукашэвіч | **- 1** |
| **18 сакавіка** | Лукашэнка на сустрэчы з расійскімі журналістамі падкрэсліў: «У ўладных структур Расіі няма імкнення скарыстацца сітуацыяй, у якую патрапіла Беларусь, і задушыць яе». | **1** |
| **22 сакавіка** | Дзяржаўная Дума РФ ратыфікавала праект федэральнага закона «Аб ратыфікацыі Пагаднення паміж Расійскай Федэрацыяй і Рэспублікай Беларусь аб стварэнні і функцыянаванні аб'яднанай сістэмы сувязі рэгіянальнай групоўкі войскаў (сіл) Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі» | **2** |
| **22 сакавіка** | Перамовы беларускай урадавай дэлегацыі з расійскім бокам па пытаннях крэдытна-фінансавага супрацоўніцтва ў адпаведнасці з раней дасягнутымі дамоўленасцямі адбыліся ў Маскве. Беларускую дэлегацыю ўзначальваў міністр фінансаў Андрэй Харкавец. | **2** |
| **24 сакавіка** | Дзяржаўны сакратар Савета бяспекі Беларусі Леанід Мальцаў: «Важна паслядоўна развіваць і ўмацоўваць ваеннае і ваенна-тэхнічнае супрацоўніцтва з Расіяй, а таксама павышаць эфектыўнасць Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспекі» | **1** |
| **30 сакавіка** | Пасяджэнне аб'яднанай калегіі міністэрстваў юстыцыі Беларусі і Расіі, падпісана праграма супрацоўніцтва паміж міністэрствамі юстыцыі Беларусі і Расіі на 2011—2012 гады | **2** |
| **30 сакавіка** | Нацыянальны банк дазволіў беларускім імпарцёрам свабоднае правядзенне плацяжоў у беларускіх рублях, расійскіх рублях і тэнге на карысць суб'ектаў гаспадарання Расіі і Казахстана за імпартнае абсталяванне, якое набываецца | **1** |
| **31 сакавіка** | Міністр эканомікі Мікалай Снапкоў не сумняваецца, што Мытны саюз пазітыўна адаб'ецца на эканоміцы Беларусі | **1** |
| **Разам** | | **20** |

# Развіццё адносін Беларусі з Кітаем

| Дата | Падзея | Бал |
|---|---|---|
| **2011/01/27** | Заява саветніка пасольства КНР у Беларусі аб разглядзе магчымасці рэалізацыі каля 20 новых праектаў на суму больш за 5 млрд. долараў. | **1** |
| **2011/02/16** | Выступленне першага віцэ-прэм'ера Беларусі Уладзіміра Сямашкі ў Парламенце, каментары аб працягу беларуска-кітайскага эканамічнага супрацоўніцтва, выдзяленні сродкаў (676 млн. даляраў) на стварэнне новых вытворчасцяў. | **1** |
| **01/01.—2011/03/31** | Нячастыя, але рэгулярныя і выключна станоўчыя згадкі ў беларускіх СМІ аб узаемавыгадным супрацоўніцтве Беларусі і Кітая. 1 | **1** |
| **Разам** | | **3** |

# Развіццё адносін Беларусі з «трэцім светам»

| Дата | Падзея | Бал |
|---|---|---|
| **21—23 лютага** | Візіт афіцыйнай дэлегацыі на чале з міністрам замежных спраў Кубы Бруна Радрыгесам Парыльей | **2** |
| **28 лютага — 2 сакавіка** | Візіт міністра замежных спраў, міжнароднага супрацоўніцтва і гамбійцаў за мяжой Рэспублікі Гамбія Мамаду Тангара | **2** |
| **2—4 сакавіка** | Візіт міністра юстыцыі В. Галаванава ў Іран | **2** |
| **Разам** | | **6** |

**Шкала ацэнкі падзей:**

- Эканамічная і палітычная інтэграцыя, стварэнне наднацыянальных органаў (ратыфікацыя адпаведных дагавораў) — 5-7 балаў
- Падпісанне / ратыфікацыя важнага дагавора — 4 балы
- Візіт вышэйшага ўзроўню — 3 балы
- Візіт узроўню міністра, парламенцкай дэлегацыі, перамовы аб заключэнні дагавораў — 2 балы
- Пазітыўныя заявы першай асобы, МЗС, парламенцкія рэзалюцыі, пазітыўныя матэрыялы ў дзяржаўных (альбо кантраляваных дзяржавай) СМІ — 1 бал
- Негатыўныя заявы першай асобы, МЗС, СМІ, парламенцкія рэзалюцыі, негатыўныя матэрыялы ў дзярж. СМІ — мінус 1 бал
- Зацягванне ратыфікацыі дагавораў, незапрашэнне на мерапрыемствы, не аказанне падтрымкі на міжнародным узроўні — мінус 2 балы
- Парушэнні дагавораў, узаемных абавязацельстваў — мінус 3
- Гандлёвыя войны, антыдэмпінгавыя расследаванні — мінус 3
- Байкот тавараў, эмбарга, высылка дыпламатаў, водгук амбасадараў — мінус 4
- Разрыў дыпламатычных адносін, правакацыі, ваенныя дзеянні — мінус 5-7